# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ГАЗЕТА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

ГАЗЕТА ЎЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

ПЯТНІЦА
22 кастрычніка
1992 года
№ 18
(1683)


У СПРЭЧКАХ

## ЗБС І ХБС. ХТО КАГО?

Мне, пабочнаму назіральніку, між іншым здаецца, што на мэтах і задачах прынцыповай розніцы паміж гэтымі суполкамі няма. Але, відавочна і згода паміж імі таксама адсутнічае.

Год таму быў утвораны Хаўрус беларускамоўных студэнтаў. **Аляксей ГЛУШКО**, студэнт хімфака і прадстаўнік Задзіночання беларускіх студэнтаў, лічыць, што справу, распачатую год назад Хаўрусам, можна весці ў межах аднае арганізацыі. Яму здаецца нават смешным існаванне ва універсітэце дзвюх амаль аднолькавых студэнцкіх арганізацый.

**Алесь ШАВЕЛЬ,** былы студэнт гістарычнага факультэта, старшыня Хаўруса, наадварот, лічыць: чым больш будзе беларускамоўных плыняў, тым лепш. Ён не супраць ЗБС, ён толькі не адабрае знішчэнне ХБС.

Справа яшчэ і ў тым, што многія студэнты з рады ХБС даўно ўжо перайшлі ў ЗБС, які, дарэчы, зарэгістраваны ў травені гэтага года.

У выніку перамоў было вырашана сабраць Сойм Хаўруса і дзейнічаць далей у адпаведнасці з абставінамі: альбо абраць новую раду і новага старшыню, альбо аб'яднаць усіх студэнтаў у ЗБС.

Але цяпер відавочна адзінае — што большую частку універсітэцкага студэнцтва справа ЗБС і ХБС пасапраўднаму пакуль не цікавіць. Што будзе далей — пакажа час.




На плошчы Незалежнасці — бурлівыя мітынгі пад чырвонымі і белчырвона-белымі сцягамі.

А што ж моладзь Беларусі?

Як ні дзіўна, менавіта яна ў шэрагах тых, хто ад палітыкі стаміўся. Больш прыемна паслухаць рок-канцэрт.

Што ж, кожнаму часу — свае куміры...

Фота С. ВАСІЛЬЕВА.

ВЫ ЧУЛІ?

## СТУДЭНТ, ЗАВОЧНІК, АСПІРАНТ? ПЛАЦІ!

**З 1 верасня Саўмін вырашыў павялічыць плату за карыстанне інтэрнатамі для студэнтаў вышэйшых, навучэнцаў сярэдніх спецыяльных і прафесійна-тэхнічных устаноў, а таксама слухачоў падрыхтоўчых аддзяленняў пры ВНУ у памеры 10 працэнтаў ад мінімальных (базавых) узроўняў стыпендый адпаведных катэгорый навучэнскай моладзі.**

**Улічваючы, што інтэрнат інтэрнату — розніца, Міністэрству адукацыі даручана ў трохмесячны тэрмін разгледзець пытанне аб увядзенні дыферэнцыраванай платы за карыстанне інтэрнатамі ў залежнасці ад умоў пражывання.**

**Ад «кватэрнай платы» вызвалены наогул дзецісіраты і дзеці, якія засталіся без апекі бацькоў. Бясплатна прадастаўляецца інтэрнат членам сем'яў загінуўшых ваеннаслужачых, інвалідаў Вялікай Айчыннай вайны І і ІІ груп і прыроўненым да іх асобам, а таксама інвалідам і асобам з недахопамі разумовага і фізічнага развіцця.**

**Аспірантам, завочнікам, абітурыентам плата за займаемую плошчу будзе значна вышэйшай. Яна праводзіцца па стаўках, зацверджаных выканкамамі абласных і Мінскага гарадскога Савета народных дэпутатаў. Застаецца спадзявацца, што яе памер не зраўняецца з коштам «люкса» ў пяцізоркавым гатэлі.**

САМ-НАСАМ

СА СТАРШЫНЁЙ

## ШУШКЕВІЧ ВЯРНУЎСЯ Ў РОДНЫ УНІВЕРСІТЭТ. НА СУСТРЭЧУ

7 КАСТРЫЧНІКА ВА УНІВЕРСІТЭТЕ АДБЫЛАСЯ СУСТРЭЧА СА СТАНІСЛАВАМ СТАНІСЛАВАВІЧАМ ШУШКЕВІЧАМ. ТАК, СА СТАРШЫНЁЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ. АЛЕ ЯШЧЭ — І БЫЛЫМ СТУДЭНТАМ, ВЫКЛАДЧЫКАМ, ЗАГАДЧЫКАМ КАФЕДРЫ І ПРАРЭКТАРАМ БДУ.

*Ён адразу прызнаўся, што не можа ў гэтай аўдыторыі не быць самім сабой. Тут ён працаваў з 1961 года да апошняга часу, толькі з трохгадовым перапынкам, калі быў накіраваны на работу ў радыётэхнічны інстытут.*

*Калі вобразна ўявіць сабе шлях Шушкевіча наверх як некалькі крокаў праз плошчу Незалежнасці ад аднаго будынка да другога, нельга не прызнаць: не кожны здольны вяртацца па гэтым шляху, не назад, зразумела, а да сваіх вытокаў. Станіслаў Станіслававіч зрабіў крокі ў зваротным напрамку, каб сустрэцца з намі і з самім сабою ранейшым. Дзякуй яму за гэта.*

*Мы прапануем вам справаздачу аб сустрэчы са Старшынёй Вярхоўнага Савета рэспублікі, калі пасля яе прайшло амаль два тыдні, уяўляючы агульную цікавасць да размовы, якая вялася на ёй, а таксама ўлічваючы тое, што не ўсе жадаючыя трапілі па розных прычынах у перапоўненую актавую залу галоўнага корпуса і што рэспубліканскія сродкі масавай інфармацыі не распавядалі аб гэтай сустрэчы падрабязна.*

*(Заканчэнне на 2-й стар.).*

ПАДПІСКА-93

## А «Коммерсант» адзін

У пятніцу «Комсомолка» разышлася першай. Потым зніклі апошнія тры экземпляры «Знамени юности». Так здараецца ў газетным кіёску галоўнага корпуса і ў іншыя дні тыдня. Дарэчы, у пятніцу асаблівым поспехам карыстаецца «Советская Белоруссия» — танная газета (усяго рубель каштуе), якая друкуе ў гэты дзень праграму тэлеперадач. У «Известиях» тэлепраграма ёсць таксама, але гэта ў некалькі разоў даражэй.

Танныя газеты, дарагія газеты... Ці даўно мы сталі ўжываць такія словазлучэнні? Здаецца, зусім нядаўна «Московские новости» каштавалі 50 капеек і лічыліся дарагой газетай, але кожны тыдзень такія чэргі за ёй збіраліся! А сёння гэта выданне каштуе 6 рублёў 90 капеек і, пэўна, не толькі з-за кошту не карыстаецца асаблівай папулярнасцю: і апошні нумар стосам ляжыць, і папярэдні.

Сёння вялікі попыт у «СПИД-инфо», многія пытаюцца пра гэты штомесячнік і не баяцца аддаць за некалькі старонак тэксту на шэрай паперы 10 рублёў. Але ў кіёсках «Саюздруку» гэту газету цяпер цяжка сустрэць — пасля вядомай пастановы аб эратычных і парнаграфічных выданнях, якая патрабуе прадаваць іх у спецыяльна адведзеных месцах.

Самыя трывалыя «аўтсайдэры» ў газетным кіёску галоўнага корпуса — «Красная звезда», «Белорусская нива» і «Мінская праўда». Іх можна купіць і ў другой палове дня, і на наступны дзень, і нават яшчэ пазней.

Наўрад ці хто стане ў апошнія дні падпісной кампаніі рабіць свой выбар з улікам поспеху тых ці іншых выданняў у кіёску — кожны зыходзіць са сваіх прыхільнасцяў і памераў кашалька. А калі вы наогул не выпішаце ніводнай газеты, не сумуйце. Часцей наведвайце з новага года газетны кіёск галоўнага корпуса. Яго ветлівая гаспадыня Еўдакія Харытонаўна Юзефовіч, якая працуе тут ужо шмат гадоў, хутка запамінае сваіх пастаянных пакупнікоў і іх любімыя выданні. Вось толькі купіць у яе «Коммерсант» вы асабліва не разлічвайце: ён наведвае наш кіёск у адзіным экземпляры.

РАТУЙЦЕ!

## ВУЧЫЦЦА — НЕ ВУЧЫЦЦА?

**Непрадбачлівасць працаўнікоў Мінцепласеткі прымусіла на мінулым тыдні студэнтаў-біёлагаў і радыёфізікаў змагацца. Спачатку ў куртках і паліто супраць ледзянога паветра ў аўдыторыях і пакоях інтэрната нумар тры. А потым — наогул супраць заняткаў у надзвычайна халодных умовах. У дэканатах факультэтаў было вырашана прыпыніць заняткі на тыдзень і даць магчымасць студэнтам памяняць халодную «зону» на цяпло роднага дома.**

**Па словах прарэктара па адміністрацыйна-гаспадарчай рабоце У. І. Тарасевіча, праблема вырашана дзякуючы агульным намаганням, у тым ліку і рэктара універсітэта. Заняткі аднавіліся ў панядзелак 19 кастрычніка.**

**А што будзе, калі грымнуць сапраўдныя маразы? Напэўна, нам, гаротнікам, хутка прыйдзецца зімаваць дома.**

ЗА ПАРТАМІ — ВЫКЛАДЧЫКІ

## ЯК ПА-БЕЛАРУСКУ?

Курсы беларускай мовы для выкладчыкаў існуюць ва універсітэце ўжо на працягу трох гадоў, але толькі з мінулага навучальнага года гэтая справа набыла масавы характар.

Уладзімір Аляксандравіч **НАУМОВІЧ**, загадчык кафедры беларускай мовы і літаратуры для прыродазнаўчых дысцыплін, паведаміў, што ў мінулым годзе курсы наведала каля 230 выкладчыкаў універсітэта. А пэўным вынікам стала тое (магчыма, гэта заслуга не толькі курсаў), што на многіх факультэтах універсітэта пачалося выкладанне на беларускай мове і спецыяльных дысцыплін.

Кафедрай падрыхтавана некалькі праграм, разлічаных на 24, 40, 60 і 90 гадзін. Кожны выкладчык у адпаведнасці з глыбінёй ведання беларускай мовы выбіраў курс.

Зразумела, найбольшая ўвага надаецца практыцы вуснага маўлення. Многія выкладчыкі курсаў уваходзяць у камісію па спецтэрміналогіі і складанню адпаведных слоўнікаў. Прычына інтарэсу да мовы — дзесяціпрацэнтная надбаўка да зарплаты? Альбо боязь апынуцца заўтра без працы? Што яшчэ? Хочацца верыць усё ж, што жаданне карыстацца, нарэшце, сапраўднай роднай мовай.

Т. КАЗАК.

ВАША МЕРКАВАННЕ

## САЦЫЯЛОГІЯ ПРА НАВУЧАННЕ

Вось некаторыя вынікі. За двухступеньчатую сістэму адукацыі выказаліся 56 працэнтаў апытаных, толькі 2 працэнты аднесліся да яе крытычна, а 42 яшчэ не вызначылі сваіх адносін да новай сістэмы.

52 працэнты рэспандэнтаў лічаць, што менавіта бясплатнае навучанне зяўляецца прычынай невысокай якасці падрыхтоўкі спецыялістаў; толькі 12 працэнтаў апытаных упэўненыя, што ўвядзенне платы павысіць якасць адукацыі. 17 працэнтаў не вельмі ў гэтым упэўнены, а 71 працэнт вагаецца паміж «так» і «не».

Супраць поўнага пераводу выкладання на беларускую мову выказалася 80 працэнтаў студэнтаў, якія прынялі ўдзел у апытанні, 16 працэнтаў — за, а 4 працэнты абыякавыя да мовы выкладання.

ЯКРАЗ ДЛЯ ВАС?

## «АРАНЖАВАЯ КНІГА» АШО ВЫЙШЛА!

Спадары студэнты, калі вас непакоіць праблема ўнутранага развіцця — звярніце ўвагу на паліцы сучасных кнігапошаў (Нацыянальная бібліятэка Беларусі і іншыя). Нядаўна ў Мінску пачала прадавацца «Аранжавая кніга. Вымярэнні невядомага» Ашо (Шры Раджніша).

Дасягнуць глыбінь сваёй унутранай сутнасці вам дапаможа практыка. Вопыт Усходу — стос медытацыйных тэхнік — сабраны Раджнішам са ўсіх часоў і краін.

У цэлым гэта гарэзлівая, цёплая кніга, якая дапаможа вам светла правесці рэшткі вольнага часу. Своеасаблівы гумар Раджніша, а таксама аповед пра яго незвычайны лёс у дадатак да медытацыйных тэхнік — гэта ўсё «Аранжавая кніга. Вымярэнні невядомага».

Калі вас не напалохае кошт — 200 рублёў — вы знойдзеце добрую кнігу.

«Калі ты сустракаеш прасветленага Майстра, адбываецца цуд. У нас адбываецца інтуітыўнае прызнанне таго, што гэты чалавек прадстаўляе нашу вышэйшую магчымасць, таго, што ён ёсць тое, чым мы можам быць...»

Н. ЖУК.

САМ-НАСАМ СА СТАРШЫНЁЙ

# ШУШКЕВІЧ ВЯРНУЎСЯ Ў РОДНЫ УНІВЕРСІТЭТ. НА СУСТРЭЧУ

— Чаму я імкнуўся сустрэцца з універсітэтам? — сказаў ён у пачатку сустрэчы.— Відавочна, гэта тая аўдыторыя, што найбольш шчыра, і дакладна можа паставіць пытанні, з якіх можна зразумець: што адбываецца ў нашым грамадстве, у першую чаргу, з інтэлігенцыяй, са студэнцкай моладдзю. На іх мы вельмі-вельмі разлічваем зараз, і калі ў гэтых накірунках знойдзем спосаб станоўчага вырашэння праблем, перспектывы ў нашай дзяржавы, я думаю, добрыя.

Я не рыхтаваў ніякага тэксту спецыяльна для выступлення перад выкладчыкамі, студэнтамі і супрацоўнікамі Беларускага дзяржаўнага універсітэта. Я хацеў бы, каб наша гаворка пайшла ў рэчышчы тых пытанняў, якія паставіце вы.

Хачу коратка ахарактарызаваць той момант, які мы перажываем сёння. Цяпер мы больш, чым калі-небудзь раней, усведамляем, што, калі мы жылі ў былым Савецкім Саюзе, мы, на жаль, не стварылі прававой асновы для ўзаемадзеяння былых суб'ектаў СССР. Нам цяпер не дастае пагадненняў паміж дзяржавамі, каб будаваць нашы адносіны.

Што да палітычнай галіны, тут вельмі цяжка рухацца далей наперад. Мы не можам пайсці на больш цесны палітычны саюз, бо гэта фактычна забараняе нам наша заканадаўства — мы павінны паспрабаваць свае сілы як самастойная незалежная дзяржава. Па тых жа прычынах мы не можам ісці і на больш цесны ваенны саюз. Але ў нас няма ніякіх перашкод для таго, каб мы дзейнічалі вельмі шырока, вельмі актыўна ў эканамічнай галіне, каб мы ўсталявалі пэўную фінансавую сістэму, якая б спрыяла развіццю эканомікі краін СНД. Мы павінны знайсці варыянты, выгадныя для ўсіх. Але тут ёсць вялікія цяжкасці.

Зусім нядаўна на падобных сустрэчах я казаў, што нам трэба захаваць рублёвую зону, каб весці вялікі абмен або гандаль з Расіяй, куды мы накіроўвалі 80 працэнтаў нашай гатовай прадукцыі. Здавалася б, мы і жывём у рублёвай зоне: і ў Расіі, і ў Казахстане, і пакуль яшчэ на Украіне, і ў рэспубліках Сярэдняй Азіі рублём карыстаюцца. Але справа ў тым, што калі мы зарабілі гэты рубель, напрыклад, у Казахстане, мы нічога не зможам за яго купіць у Расіі. Што адбылося? У нас ёсць не вельмі добра кантралюемая эмісія грошай, і кожная рэспубліка ўводзіць пэўныя сумы грошай, якія не забяспечаны ніякімі таварамі ў рамках тых цэн, якія існуюць у нашай структуры. Па гэтай прычыне цэны растуць, і мы маем вялікую інфляцыю. І тут трэба альбо рабіць хірургічную аперацыю, альбо імкнуцца да стабільнасці нашых грошай, а пасля выводзіць іх на ўзровень, вызначаны эканомікай і банкам, каб яны абменьваліся на свабодна канверсаваную валюту. Калі мы на гэтыя цяжкія крокі не пойдзем, у нас няма надзеі ператварыцца ў цывілізаваную сістэму.

Прэзідэнт Расіі адабраў у мяне лозунг: «Давайце прыйдзем да згоды, каб зрабіць рэформы». Калі мы не рэфармуем нашу гаспадарку, мы будзем і не ў старым стане, і не ў новым. І чым даўжэй мы будзем у такім стане, тым горш для нас. Што нам трэба зрабіць? Нам трэба прайсці два вельмі важкіх этапа: першы — падрыхтаваць пэўныя дзяржаўныя структуры да прыватызацыі, а другі — правесці прыватызацыю. Вярхоўны Савет падрыхтаваў на бліжэйшую сесію пакет прапаноў па гэтай праблеме. Мы дэталёва разглядалі іх на сумесным пасяджэнні Прэзідыума Вярхоўнага Савета і Прэзідыума Савета Міністраў. Я магу вам з вялікім задавальненнем сказаць, што зроблены вялікі крок у накірунку прыватызацыі. Я спадзяюся, Вярхоўны Савет гэты закон прыме.

Ёсць прадпрыемствы, якія не трэба рыхтаваць да прыватызацыі, іх можна прыватызаваць ужо. Але прыватызацыі супрацьстаіць тая структура, якая трымае ў руках гандаль і транспартныя сродкі. Бяда ў тым, што супрацьстаіць яна на падставе тых законаў, якія ў нас дзейнічаюць.

На маю думку, Вярхоўны Савет падрыхтаваны для вырашэння неадкладных пытанняў, у тым ліку, да ратыфікацыі шэрагу міжнародных пагадненняў. У першую чаргу, гэта пагадненне аб звычайных узбраеннях. Калі мы не пададзім ратыфікацыйныя граматы аб ратыфікацыі гэтага дагавора да 3 лістапада галандскаму ўраду, можа быць скандал. Я спадзяюся, гэтага не здарыцца.

Я спадзяюся таксама на вялікі прагрэс у праблеме прыняцця новай Канстытуцыі. Па многіх напрамках мы прыйшлі да згоды ў межах Кансультацыйнага савета і тых дэпутацкіх груп, якія працуюць у межах Канстытуцыйнай камісіі, але да шэрагу пытанняў існуюць розныя падыходы. Я не ўпэўнены, што іх удасца вырашыць менавіта на гэтай сесіі. Адна з іх — праблема мясцовага самакіравання. На гэты пераходны перыяд патрабуецца моцная сістэма ўлады. Разам з тым, дэмакратычны рух на Беларусі патрабуе, каб усялякая ўлада, выканаўчая ў тым ліку, абапіралася непасрэдна на народ. Тут трэба знайсці разумны падыход, каб дзяржава заставалася дзяржавай і каб дэмакратычныя прынцыпы пры гэтым захоўваліся.

Відавочна, я быў бы не самім сабой, калі б не сказаў вам аб тых праблемах, якія існуюць у нас з забеспячэннем работнікаў адукацыі. Як вы ведаеце Вярхоўны Савет прыняў рашэнне аб тым, што артыкул 34 Закона аб адукацыі будзе ўведзены ў дзеянне з 1 верасня гэтага года. Калі былі падлічаны тыя сродкі, якімі ўрад можа карыстацца ў гэтых мэтах, высветлілася, што іх проста няма. Гэта праблема горача абмяркоўвалася на нашай сумеснай з урадам нарадзе. І вось тут, я вымушаны вам прызнацца, мы пайшлі на крок, за які можам быць асуджаны сесіяй Вярхоўнага Савета. Мы прапанавалі нашаму Нацыяльнаму банку даць ураду крэдыт, каб вырашыць гэта пытанне ў адпаведнасці з прынятым законам. Але я зноў жа быў бы няшчырым чалавекам, каб не растлумачыў вам, да чаго гэта вядзе. У агульначалавечым сэнсе гэта фактычна значыць, што мы жывём за кошт сваіх папярэднікаў або за кошт сваіх дзяцей і ўнукаў. Мы можам і павінны пайсці на такі крок дзякуючы інтэграцыі, у якой існуем. Нашы суседзі, з якімі мы знаходзімся ў адной рублёвай прасторы, такія рашэнні прымаюць, свае запазычанасці павялічваюць, і нам нельга гэтага не зрабіць. Калі мы на такі крок не пойдзем, нашы суседзі будуць у нейкай ступені жыць за наш кошт.

*Потым Станіслаў Станіслававіч адказваў на пытанні, якія задавала яму зала. Цяжка сказаць, чым былі для яго пры гэтым родныя сцены — дапамогай ці перашкодай. Але праз дзве гадзіны насычанай размовы ён трымаў у руках унушальнага выгляду стос цыдулак з пытаннямі і быў гатовы працягваць адказваць на іх. А зала ўжо стамілася, добрая частка яе да гэтага часу разбеглася, забыўшыся на павагу да госця і да сябе...*



## ПРА РЭФЕРЭНДУМ

*— Як Вы лічыце, ці не час Беларусі ўвайсці ў склад Расіі?*

— Гэта абсалютны абсурд — тое ж самае, што пераадолець планку на вышыні два метры, не адарваўшыся ад зямлі.

*— Пан Шушкевіч, якое Ваша стаўленне да таго, каб аднавіць старажытную назву нашай Айчыны — Літва?*

— Маё стаўленне адмоўнае. Аб гэтым не так проста гаварыць. Так, Аляксандр Сяргеевіч Пушкін пісаў аб карчмах на літоўскай граніцы, а нас называлі літвінамі. Але я лічу, што Беларусь — назва больш прыгожая.

*— Чаму Вярхоўны Савет рэспублікі і яго Прэзідыум робяць усё для таго, каб праігнараваць волю і правы звыш 440 тысяч грамадзян Рэспублікі Беларусь і не дапусціць правядзення рэферэндуму?*

— Я лічу, што рэферэндум трэба правесці, і няма ніякіх іншых падыходаў. Больш складаная праблема — змест таго пытання, якое будзе пастаўлена перад народам. Успомніце вынікі рэферэндуму аб захаванні СССР: 85 працэнтаў аддалі голас за захаванне, а на Украіне, калі нармальна паставілі пытанне, амаль 90 працэнтаў выказаліся супраць. Мы не маем права ўводзіць народ у зман мудрагелістым пытаннем, трэба знайсці паразуменне.

*— Няўжо Вы лічыце, што дзеля бяспекі рэспублікі лепш удзельнічаць у вайсковым блоку СНД, чым у НАТА?*

— Беларусь не можа ўдзельнічаць ні ў якім блоку, у нас ёсць закон, які забараняе гэта рабіць. Але мы па інерцыі застаемся пакуль у былым саюзе (я маю на ўвазе вайсковы). Калі мы з яго выйдзем, у іншы не маем права ўступаць.

*— Чаму мы не зацікаўлены ва ўвядзенні беларускай нацыянальнай валюты? Вялікая ганьба — карыстацца ў незалежнай краіне грашовымі адзінкамі неіснуючага СССР...*

— Няма больш дрэннай справы, чым увесці валюту і абясцэніць яе. Вось тады ўсе будуць смяяцца. Валюту трэба ўводзіць, калі ёсць больш-менш стабільная эканоміка альбо калі эканоміка хаця б не каціцца ўніз, як у нас. Справа не ў тым, як надрукаваць грошы, з гэтым няма праблем. Так, патрэбны пэўныя выдаткі, але рэспубліка можа іх панесці. Больш за тое, у нас ёсць гарантыі міжнародных валютных структур, якія раней катэгарычна адмаўлялі нам у крэдытах для стабілізацыйнага фонда. А цяпер яны нам гэта прапануюць. Праўда, пакуль не ў дастатковай колькасці. Нам трэба рухацца далей.

*— Колькі пасольстваў Беларусі ў замежных краінах і як гэта адбіваецца на бюджэце рэспублікі?*

— Пасольстваў можна стварыць колькі хочаце, але мы стварылі столькі, колькі дазваляюць нам нашы сродкі, прычым з такім разлікам, каб прыбытковая частка дзейнасці пасольстваў перавышала выдаткавую. Пасольствы вядуць цэлы шэраг камерцыйных спраў, садзейнічаюць нашаму гандлю і рэкламе.

Пакуль у нас ёсць пасольства толькі ў Польшчы. Нашы прадстаўнікі працуюць у Вашынгтоне, Нью-Йорку, Жэневе і ў Парыжы пры ЮНЕСКА.

Наогул жа канцэпцыя знешнепалітычнай і знешнеэканамічнай дзейнасці заслугоўвае сур'ёзнага абмеркавання. Я лічу, што адна з галоўных праблем тут — адсутнасць кваліфікаваных кадраў. У нас ёсць дамоўленасць з Германіяй і Францыяй аб падрыхтоўцы там нашых дыпламатаў.

## АБ ПРЭЗІДЭНЦТВЕ

*— Ці не час увесці прэзідэнцкае праўленне? Гэта здыме шмат праблем...*

— Так, шмат праблем здыме, але яшчэ больш створыць. Мяне ўсё больш схіляюць да таго, што ўзровень аўтарытарнасці павінен быць павялічаны, і ёсць шмат аргументаў на карысць гэтага. У цяжкі пераходны перыяд асобаснае вырашэнне праблем, аўтарытарны падыход, пэўна, могуць быць з'яўай станоўчай. Але асабіста я лічу што пры нашым цяперашнім узроўні парламентарызму рызыкоўна ўводзіць прэзідэнцкае праўленне.

*— Апошнім часам усё часцей чуваць пра нейкія непаразуменні паміж Шушкевічам і Кебічам і наогул паміж Вярхоўным Саветам і ўрадам. Ці маюць гэтыя чуткі сур'ёзны грунт пад сабой?*

— Друк у нас вольны, ён можа апублікаваць любыя чуткі, ніхто яго за гэта не трасе. Я думаю, што наш урад мог бы працаваць лепей, а ўрад думае, што Вярхоўны Савет мог бы працаваць лепей. Ну што тут дрэннага? Супрацьстаяння ў нас няма. Я лічу, што яно не на карысць нікому. Трэба шукаць шляхі высвятлення пытанняў, а не шляхі выяўлення адмоўных рысаў апанентаў.

*— БНФ у час выбараў Вас Старшынёй падтрымліваў Вашу кандыдатуру. На каго Вы зараз абапіраецеся ў Вярхоўным Савеце? Ці ёсць у Вас каманда?*

— Калі размова ідзе пра дэпутацкую каманду, яна невялікая. Калі ў больш шырокім сэнсе — яна ўвесь час павялічваецца, і я вельмі рад, што многія тут маюць да гэтага дачыненне.

Я шмат разоў адказваў на пытанне аб БНФ. Гэта філасофскае пытанне. Я заўсёды высока ацэньваў і зараз ацэньваю той аспект дзейнасці БНФ, які звязаны з беларускай культурай, беларускай гісторыяй, аднаўленнем гістарычнай праўды і адносінамі да беларускай мовы. Мне непрыемна тут аб гэтым гаварыць, але... Калі будзем спяшацца, учынім многа глупстваў. Стрыманасці не хапае не толькі нашаму грамадству ў цэлым. Час ад часу я бачу, як у маім родным універсітэце на падставе адносін да беларускай мовы ёсць пэўная дыскрымінацыя сапраўдных вучоных. Я за беларускасць, я за тое, каб пераканаць гэтых людзей у тым, што і яны павінны падтрымліваць такі падыход. Але, прабачце, на гэтым узроўні не можа быць ніякага адміністрацыйнага ціску.

## ЯК ВЫ СТАВІЦЕСЯ ДА ГАРБАЧОВА?

— З вялікай павагай. Гэта чалавек, які зрабіў, на маю думку, вельмі многа. Наша палітычнае сёння — гэта яго дзейнасць. За тыя яго дасягненні яму можна паставіць манумент. І я б унёс пэўныя грошы, калі б такі збор быў.

Але потым, мне здаецца, было шмат памылак. Што мне больш за ўсё не падабалася — ён пачаў раіць рабіць тое, што раней раілі рабіць яму, а ён не рабіў. На Дзяржсавеце, як вы ведаеце (я пра гэта не раз гаварыў), мы яшчэ год таму працавалі так: калі сем чалавек хацелі прыняць не такое рашэнне, якое хацеў Гарбачоў, яны нічога не маглі зрабіць. У рэшце рэшт гэта прывяло да таго, што Садружнасць стала лепшай формай інтэграцыі. Я лічу, што рашэнне аб стварэнні СНД было станоўчае.

Нядаўна я сустрэўся з Гарбачовым у Германіі. Ён там выступаў з дакладам, я таксама. Што мне не падабалася — Еўропа гатова яго насіць на руках, а ён сябе разглядае як Прэзідэнта Злучаных Штатаў Свету; ён можа ўсім даваць парады і за мяжой лёгка знаходзіць тую аўдыторыю, якая яго шалёна паважае. Гэта я бачыў на ўласныя вочы. Мяне абражае, што Гарбачоў згадзіўся з прапановай 140 парламентарыяў свету ўзначаліць Зялёны Крыж. Я думаю, тое, што ўтойвалася менавіта ім па Чарнобылю, не дае яму маральнага права займаць такую пасаду.

## З АСАБІСТАГА

*— А гэта праўда, што Вы паляк?*

— Відавочна, адна шаснаццатая частка польскай крыві ў ва мне ёсць: мая бабка па лініі маці была каталічкай. Мяне гэта не абражае. Я лічу польскую нацыю вельмі высакароднай, вельмі дастойнай. Цяпер ужо і не ведаю, што рабіць, бо жонка ў мяне напалову украінка, напалову расіянка. Дык можа мне там шукаць палітычны прытулак?

*— На якой мове Вы размаўляеце па-за працай?*

— Дома я гавару пераважна на рускай, мове, бо, на жаль, у мяне няма часу навучыць беларускай мове сына. Але нічога, яго вучаць мове ў школе.

*— Ці не надакучае Вам настальгія па настаўніцтву, па навуковай дзейнасці?*

— Я час ад часу прачынаюся і думаю, што трэба бегчы ва універсітэт...

*— Вашы шчырыя думкі наконт беларусізацыі ва універсітэце?*

— Тэрмін «беларусізацыя» мне не падабаецца. Мне падабаецца тэрмін «адраджэнне» — нацыянальных традыцый, нацыянальнай культуры, нацыянальнай мовы. Універсітэт — гэта галоўны цэнтр, які павінен перш за ўсё кіравацца навуковым падыходам, розумам і патрыятызмам. Я ганаруся тым, што сёння універсітэту ніхто не перашкаджае. Магчыма, вы не маеце той падтрымкі, якую б хацелі, але маеце вялікую ступень самастойнасці.

*— Якія дзеянні і калі будуць распачаты для дапамогі ў працаўладкаванні выпускнікам фізічнага факультэта?*

— Я думаю, калі яны будуць атрымліваць сапраўды дзейсную адукацыю, праблемы з іх уладкаваннем на работу не будзе. Ужо сёння фізікаў з задавальненнем бяруць камерцыйныя структуры і нават замежжа. Трэба добра вучыцца, а не запісвацца ў чаргу на атрыманне дыплома.

*— Якія перспектывы работы за мяжой супрацоўнікаў універсітэта?*

— Хутка прымем закон аб выездзе. Але ужо зараз многія працуюць за мяжой і добра зарабляюць. Я не лічу, што яны дрэнна ставяцца да Беларусі, і не думаю, каб яны збеглі адсюль. Яны прыцягнуць сюды сродкі, пачнуць тут сваю справу. Я не падзяляю гэты лямант аб тым, што «ўцякаюць мазгі». Калі мы не можам забяспечыць пэўнай работай — няхай людзі працуюць за мяжой, для сябе і для дзяржавы.

На сустрэчы прысутнічала
В. БЯГУН.

Здымак зроблены пад час мінулай сесіі Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь.
Фота С. ВАСІЛЬЕВА.

ЭЛЕГІЯ

# ПРАБІВАЮЧЫСЯ ПРАЗ НЕМАГЧЫМАСЦЬ

**Мы выкараскаемся, так? З той жудасці, у якой мы зараз жывём. Мы ўсё роўна выблытаемся, інакш мы б не былі людзьмі.**

**Так цяжка жыць — а нашы продкі ўслаўлялі жыццё. Чаму? Не трэба пытацца. На сваім шляху лепш зрабіць тое, што можна,— каб свяціла надзея.**



І прыкладам будуць вершы. Вершы канцэнтруюць нас. Яны жывуць сваім часам. Колькі год назад выйшла кніжка Алеся Разанава «Вастрыё стралы» — як водбліск касмічнай свядомасці часу. Пасля адзін з 90-х гадоў назавуць «годам Космасу» — у чалавеку, аказваецца, гэта ўжо адбылося.

Космас і чалавек непадзельныя. Мова мастацкага твора гаворыць аб гэтым. Творца заўсёды афармляе рэальнасць, якая надыходзіць знутры, а розум — толькі сродак афармлення ведаў, гэта здаўна ведаюць у Індыі.

Мы ўступаем у Новую эру. Мы змяняемся на вачах. Давайце прыслухаемся — якой яна будзе?

Час —
Калі адна мэта
Слухаецца другую.
Бясчассе —
Калі замінае
Кожная кожнай.

Гэта неверагодна — уменне паэта ўвасобіць час у адным слове.

Мы рушым да змен у сабе. «Свядомасць — гэта ключ»,— пісаў Сатпрэм. Час новых форм яшчэ не надышоў — свядомасць засталася ранейшай, хаця час пакажа яе неадпаведнасць новаму павеву. Космас побач.

Дакуль мне яшчэ
трываць?
Птах, з якім я лячу
праз імглістую бездань
часу,
з няволі — у
вызваленне, са скрухі —
у радасць,
з цемры — у светлыню,
паварочвае да мяне галаву
і кажа:
датуль, пакуль хоціць
часу,
датуль, пакуль хоціць
цябе самога,
датуль, пакуль хоціць
нас...
(«Палёт»).

Але не магу я вярнуцца
туды, дзе ўжо быў,—
проці сваіх слядоў,
і не магу затрымацца
тут, дзе знаходжуся сёння.
Мая прастора — мяжа.
Мой час — вастрые.
Мой шлях — шлях
агню: адгэтуль.
(**«Адгэтуль»**).

Мы — сведкі таго, што абураецца свет. Старое не вытрымлівае часу: «Я ў крузе, дзе Слова шукае Слова, а чалавек — Чалавека».

Мы таксама ў крузе. Гэта жудаснае намаганне выблытацца апраўдае нашы рыўкі і неўтаймаванасць, наш пошук.

«Свет маўкліва дапытваецца ў мяне, куды я іду. Але хіба я ведаю сваю канчатковую мэту?»

Бячассе. І пошукі формаў. І трэба сказаць, што апраўдана ўсё, што можа ўтрымаць чалавека ў жыцці, што дасць яму шчасце. Бо згублена шчасце. Тут пуста. Вы чуеце гэту пустэчу вакол — без цяпла і дабра,— стракатня кідкіх фарбаў і бег кінастужкі нямога кіно. Гэта свет без душы. І нам холадна ў ім.

«Усё няшчасце чалавека з-за таго, што ён не разабраўся ў прыродзе сваёй душы»,— казала Маці, якую Шры Аўрабінда Гхош назваў увасабленнем жаночай боскай сілы сусвету.

Распуста, жорсткасць вакол — чалавек спрабуе набыць сабе шчасцей. У рэчах, у багацці, у славе. А шчасця няма. Не маніце — няма яго з намі.

Цямнее зямля,
Цямнее вада,
Цямнее трава,
Цямнеюць будынкі... —
Яшчэ нядаўна ўсё мела
свае абрысы,
яшчэ нядаўна ўсё свае
межы мела...

Мы верым у тое, чаго хочам. Мы хочам так многа — і з намі падман. Ён у нас. Мы так многа манілі.

Вы памятаеце? Дзіцём вы ішлі з чыстым сэрцам насустрач жыццю — вы не ведалі, што з вамі будзе. А сёння мы запланавалі жыццё і маркотна здзіўляемся, што яно НЕ ТАКОЕ. А межаў няма! У жыцця няма межаў — бо межы стварыў чалавек. А чаму? Гэта так таямніча — чаму? Афармленне сусвету... Закон прыгажосці — адзіна рэальны, адзіна законны ў нашым сусвеце — адзіна разумны, магчымы — і, можа, таму ўратавальны? Бо хаос вакол.

Усё яшчэ спраўдзіцца ў нас. Ты толькі павер. Займі сваё месца ў сусвеце, каб рухацца далей— мы знойдзем крыніцу жыцця, мы ачысцім ад бруду наш храм. Бо свет — разам з намі, і нават бліжэй. Ён — у нас. **Н. ЖУК.**

СЛУЖБА 03

# НАВЫПЕРАДКІ З ГІПАДЫНАМІЯЙ!

Магчыма, вам ужо надакучылі размовы і газетныя артыкулы аб гіпадынаміі. Тады вы проста недастаткова разумееце шкоду гэтай з'явы і неабходнасць рухальнай актыўнасці. Гіпадынамія выклікае ў арганізме чалавека змены, якія можна разглядаць як свайго роду прыстасаванне да малых фізічных нагрузак. Гэта прыводзіць да рэзкага зніжэння фізічнай працаздольнасці, у першую чаргу, да змяншэння нагрузкі на апорна-рухальны апарат, інакш кажучы — да дэтрэніраванасці арганізма.

Пры нармальнай мышачнай рабоце скарачэнне мышцаў суправаджаецца электрычнымі, хімічнымі і цеплавымі з'явамі, якія звязаны з абменнымі працэсамі, што ідуць у мышачных тканках. Гэтыя працэсы, у сваю чаргу, могуць нармальна працякаць пры дастатковай колькасці кіслароду і пажыўных рэчываў, якія паступаюць з крывёй. А гэта значыць, што работа мышцы залежыць ад функцыяніравання сардэчна-сасудзістай, дыхальнай, нервовай і іншых сістэм арганізма. Акрамя таго, нельга забываць аб іонах кальцыя, без якіх мышачнае скарачэнне немагчыма. Асноўныя запасы кальцыя знаходзяцца ў касцях, і колькасць яго залежыць ад нагрузак, якія выпадаюць на долю касцявога апарата. Фізічныя практыкаванні садзейнічаюць назапашванню кальцыя, а гэта павышае трываласць касцей і стварае яго запас, неабходны для скарачэння мышцаў.

Што ж адбываецца ў арганізме чалавека, калі доля фізічнай працы ў яго жыцці вельмі малькая? Пры нязначных мышачных намаганнях зніжаецца інтэнсіўнасць абменных працэсаў, якая суправаджаецца змяншэннем патрэбнасці ў кіслародзе, пажыўных рэчывах, іонах кальцыя і г. д.

Здавалася б, нічога жахлівага, так? Але ж не. Калі гэты стан працягваецца доўга, развіваецца дэтрэніраванасць міякарда (змяншаецца сіла сардэчнай мышцы, колькасць крыві, якую выкідвае сэрца ў час скарачэння пагаршаецца кровазварот самой сардэчнай мышцы), парушаецца тлуставы абмен (у арганізме адкладваюцца запасы тлушчу) и назіраецца яшчэ шэраг непажаданых для здароўя з'яў.

У выніку ўсіх гэтых змяненняў парушаецца не толькі работа асобных фізіялагічных сістэм арганізма, але зніжаецца таксама разумовая і фізічная працаздольнасць чалавека, пагаршаецца яго ўстойлівасць да дзеяння розных неспрыяльных фактараў (інфекцыі, пераахаладжэння, перагрэву, змянення атмасфернага ціску і інш.). Дэтрэніраваны арганізм ужо не можа справіцца нават з нязначнымі нагрузкамі, ён хутка «стамляецца».

Як гэтага пазбегнуць? Як захаваць на доўгія гады надзейнасць у рабоце ўсіх сістэм арганізма, у першую чаргу — сардэчна-сасудзістай?

Адказ адзін — павялічыць фізічную актыўнасць. Разумнае павелічэнне долі фізічнай працы, заняткі фізічнай культурай — самы просты і даступны ўсім сродак для захавання здароўя. Дадатковыя нагрузкі для фізічна трэніраванага чалавека не стануць для яго арганізма непрыемнай нечаканасцю, бо ўсе сістэмы хутка перабудуюцца на новы, больш высокі ўзровень функцыяніравання, які забяспечыць нармальную жыццядзейнасць у створаных умовах.

Г. ГАЛЬЧАНЮК,
урач.

НЕЗАМЕННЫХ НЯМА?

# Мой адрас не дом і не вуліца



*Ёсць ва універсітэце людзі, якія займаюцца непрыкметнай для нашых вачэй справай, пазбаўляючы нас клопатаў аб дробязях надзённых.*

Сярод іх — пашпартысткі, якіх на сённяшні дзень ва універсітэце пяць. Зірніце на здымак (злева направа): **Ірына Аляксандраўна КАХНЕНКА, Марыя Уладзіміраўна МОЛНАР, Галіна Лявонаўна АНАЦКАЯ, Антаніна Паўлаўна ПІСКІЖАВА,** а таксама **Ірына Міхайлаўна НОВІКАВА,** якая, на жаль, пад час візіту нашага фотакарэспандэнта хварэла.

Усе яны працуюць у адным з пакояў студгарадка, размешчанага ў другім інтэрнаце. І кожнаму са студэнтаў (замежных таксама), асабліва ў наш час, калі прапіска — амаль гарант таго, што пэўную колькасць прадуктаў на атрыманыя талоны ты ўсё ж здабудзеш, без іх не абысціся. А часам спатрэбіцца даведка аб сямейным становішчы, зоймешся абменам пашпарта альбо перапрапіскай — ізноў жа да іх звяртаемся, да пашпартыстак. Часам і незаўважна, што без іх не выкараскацца з блытаніны папер.

...А быў яшчэ выпадак: наведаў неяк пакойчык адзін з аспірантаў філалагічнага факультэта і быў ашаломлены дакладнасцю атрыманых у звычайных пашпартыстак звестак, за якія ў юрыдычнай кансультацыі даводзіцца плаціць па 50 рублёў за кожную.

Здараецца, губляюць яны асабісты час, каб хутчэй вырашыць нашы з вамі праблемы. А мы не так ужо і часта імкнемся да таго, каб аблегчыць існаванне і сабе, і ім. Скажам, звычайная даведка з дэканата, без якой ніводнага студэнта нельга прапісваць. Толькі на гістарычным факультэце адразу ж забяспечылі імі ўсіх першакурснікаў, астатнія вымушаны дзейнічаць па прынцыпу: крок наперад і два назад.

Незаменных людзей няма. Але ці спрабаваў хто-небудзь абысціся без іх?

**Т. КАЗАК.**
**Фота С. ВАСІЛЬЕВА.**

ШКОЛА ЮНКОРА

# ЖУРНАЛІСТАМ ХАЧУ БЫЦЬ, І МЯНЕ НАВУЧАЦЬ!

Не першы год працуе на факультэце журналістыкі школа юнага карэспандэнта. Агульнае кіраўніцтва школай ажыццяўляе Таццяна Уладзіміраўна Падаляк, якая калісьці вучаніцай сёмага класа сама пачынала менавіта з яе, а цяпер выкладае на факультэце.

Гадзіна ў тыдзень — не надта вялікая плата за тое, каб адчуваць сябе больш упэўненым пры паступленні на журфак. Не, ніякімі льготамі вучні школы юнкора не карыстаюцца, але...

Калі ты ўжо паспрабаваў экспромтам пісаць матэрыялы на зададзеную тэму і абмяркоўваць свае і чужыя памылкі з дапамогай не толькі выкладчыкаў, але і выпускнікоў факультэта журналістыкі, не раз удзельнічаў у выпуску вучэбнай газеты «Журналіст» і наладзіў трывалыя сувязі з рэдакцыямі газет, ёсць падставы сцвярджаць, што школа юнкора дапамагла табе выхаваць у сабе сур'ёзныя адносіны да журналісцкай працы.

Звычайна на першы агульны сход збіраецца каля 150 вучняў старэйшых класаў сярэдніх школ і навучэнцаў сярэдніх спецыяльных устаноў, галоўным чынам з Мінска. У гэтым годзе аўдыторыя паменшылася амаль напалову. Ёсць падставы для хвалявання? А магчыма, дасягнута мэта — не заразіць журналістыкай, а прывучыць абітурыента з належнай адказнасцю ставіцца да выбару будучай прафесіі.

**Т. КАЗАК.**

НЕ СЫШЛОСЯ

# ДА БАРАЦЬБЫ НЕ ГАТОВЫ

19 кастрычніка на хімфаку адбыўся прафсаюзны сход. Абмяркоўвалася пытанне аб правядзенні супрацоўнікамі факультэта забастоўкі, пад час якой меркавалася выставіць традыцыйнае патрабаванне: павысіць зарплату навуковым супрацоўнікам і выкладчыкам, а таксама стыпендыю студэнтам. Паколькі папярэдняе галасаванне не забяспечыла неабходнай колькасці галасоў за правядзенне забастоўкі (з 276 прадстаўнікоў калектыву падтрымалі гэту прапанову толькі 86 чалавек), быў склікаць прафсаюзны сход. Наведалі яго каля 20 чалавек.

— Ці правамоцныя мы штосьці вырашаць за ўвесь калектыў? — прагучала пытанне народа.

— Не,— было ў адказ.

